*Т.І.Васюк, дацэнт*

# ШЛЯХІ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ КЕРАМІКІ Ў XXI ст.

Беларуская кераміка ў XXI ст. развіваецца ў трох напрамках: 1) народнае рамяство, 2) мастацкая кераміка, 3) вытворчая тыражная кераміка.

Аб поспехах у развіцці народных промыслаў сведчаць разнастайныя мерапрыемствы. Рэспубліканскія і абласныя святы-конкурсы “Гліняны звон” і “Ганчарны круг – 2004” яскрава адлюстроўваюць значны ўзровень развіцця мастацкіх промыслаў. У пачатку верасня 2004 г. адбылося другое рэспубліканске свята-конкурс, на якім прэмію “Гран-пры” атрымаў старэйшы майстар з Гараднoй, што на Брэстчыне, А.В.Шелест. У конкурсе браў удзел лаўрэат прэміі за духоўнае адраджэнне 2003 г. А.М.Басавец. Майстры з Гараднoй захоўваюць традыцыі беларускай керамікі.

Лаўрэатамі рэспубліканскага конкурсу “Ганчарны круг – 2004” сталі многія маладыя майстры: у намінацыі “ганчарства” – А.Насовіч з Любані, У.Сасаноўскі з Івянца, К.Цітоў з Мінска, Р.Саўрыцкі з Лагойска; у намінацыі “пластыка і свісцёлка” – А.Пратасеня з Салігорска. Лаўрэатам названы і самабытны майстар з Парыч А.Туравец, выпускнік кафедры народных рамёстваў БДУ культуры і мастацтваў. Майстры з Брэста працуюць у стылі А.Такарэўскага, у чорнаглянцаванай задымленай кераміцы. У.Зіневіч з Браслава дасканала валодае ганчарствам і пластыкай.

Святы ганчарства што праводзіліся ў Радашковічах, Лагойску, Любані, Івянцы, Дудутках удаліся. Цудоўныя вырабы майстроў радавалі гледачоў. Неаднаразова лаўрэатамі конкурсаў “Гліняны звон” былі студэнты і выпускнікі кафедры народных рамёстваў БДУ культуры і мастацтваў М.Раманоўскі, К.Цітоў, Д.Гром. Сувенірная прадукцыя народных майстроў мае вялікі попыт у насельніцтва.

У ліпені 2003 г. у Бабруйску адбыўся першы міжнародны пленэр керамікі “раку”. Гэтая культурная з`ява была прысвечана адраджэнню старажытных тэхналогій у стылі неаархаікі. У пленэры ўдзельнічалі мастакі-прафесіяналы з Масквы, Варшавы, Вільнюса, Хабараўска, Мінска, Бабруйска і іншых гарадоў. Тэхналогію керамікі “раку” паспяхова развіваюць японцы. Славянскія народы

таксама маюць цікавыя традыцыі абпалу керамікі адкрытым агнём. Тэхналогія “раку” праду- гледжвае перапынены абпал, пры якім адбываецца аднаўленчы працэс. Абпал праводзіўся ў двух’ярускнай земляной печы. Такія печы выкарыстоўваліся на ўсёй тэрыторыі славянскіх краін.

Печы для абпальвання керамікі рабіліся з камянёў, гліны, цэглы круглай або чатырохвугольнай формы. Яны размяшчаліся воддаль гаспадарчых пабудоў і былі заглыблены ў зямлю. Перад вусцем печы рабілі яму для дроў. Горны складаліся з топкі і камеры для абпальвання вырабаў. Першыя аднакамерныя горны былі падобныя на хатнюю печ, у якой гартаваўся посуд з гліны. Кераміка “раку” абпальваецца ў падобных печах–горнах, а не ў электрычных, сучасных іх разнавіднасцях. Вырабы ў горнах абпальваліся дрывамі.

Пленэрамі па кераміцы кіруе знакаміты мастак з Бабруйска В.Калтыгін, яму дапамагае А.Концуб. У першым міжнародным пленэры керамікі ўдзельнічалі Т.А.Васюк і выпускнікі кафедры народных раместваў: А.Ткачоў і А.Цітоў. Асвятлялі ў прэсе вынікі пленэру В.Равінская і Т.Пунтас з Масквы.

Міжнароднаму пленэру папярэднічалі сем рэспубліканскіх, якія праводзіў выдатны беларускі мастак-кераміст У.В.Угрыновіч. Яго вучань В.Калтыгін і іншыя беларускія мастакі прысвяцілі свае творы светлай памяці настаўніка.

Праведзены некалькі справаздачных выстаў па выніках першага і другога міжнародных пленэраў керамікі «раку», якія выклікалі вялікую цікавасць у гледачоў Мінска, Магілёва, Бабруйска, Варшавы. Маладыя мастачкі з Вільнюса Е.Паўкшцітэ, І.Жаландаўскайтэ працавалі ў тэхніцы абварной керамікі. У жніўні 2004 г. адбыўся другі міжнародны пленэр керамікі «раку» ў Бабруйску, дзе ў тэхніцы абварной керамікі працавалі ўсе мастакі, удзельнікі пленэру: З.Косерак з Варшавы, І.Радкевіч з Гродна, Л.Захарава з Пецярбурга і інш. У час пленэру праведзены эксперыменты, у выніку якіх атрыманы цудоўныя аўтарскія працы з непаўторным характарам дэкору і формы.

Абварная кераміка мае шэраг сакрэтаў. Патрэбны пэўны склад кар`ернай гліны, які вызначае трываласць чарапка. Керамічнае цеста рыхтуецца з дамешкамі. Лепка і тачэнне формы маюць свае асаблівасці. Амаль зусім не ўжываюцца прыклееныя да вырабу дэталі, якія не вытрымліваюць перападу тэмпературы ў 500°–800°С. Абвара і раку – тэхналогіі перапыненага агню. Для абвары

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

рыхтуецца кіслая баўтушка з жытняй ці пшанічнай мукі і расолу. У той час, калі вырабы маюць тэмпературу да тысячы градусаў, іх трэба абцугамі выхапіць з печы і акунуць у баўтушку.

Творчы працэс, якім ахоплены ўдзельнікі міжнародных пленэраў, дапамагае стварыць калекцыю керамікі, што ўплывае на дзейнасць майстроў не толькі ў Беларусі, але і ў суседніх краінах. Загартаваныя агнём творы размясціліся ў музеях, галерэях, жылых інтэр`ерах. Шырокі творчы размах мастака з Бабруйска В.Калтыгіна дае новы напрамак ў развіцці керамікі.

Вырабы народных майстроў Рэспублікі маюць традыцыйны прынцып у формаўтварэнні керамікі. Народныя майстры пад кіраўніцтвам прафесара Я.М.Сахуты пераасэнсоўваюць і аналізаюць набытак народа. Да нашага часу не страчаны шэраг характэрных рыс беларускай народнай керамікі: пластычнасць, лаканізм, функцыянальнасць, суладнасць, керамічнасць, тэхналагічнасць, выразнасць, супадпарадкаванасць элементаў, прыгажосць, індывідуальнасць народных майстроў. Міжнародныя пленэры па кераміцы, якія праходзяць пад Бабруйскам, сведчаць аб творчым уздыме ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, узаемаўплыве беларускага керамічнага мастацтва і мастацтва тых краін, якія прымаюць удзел у пленэрах: Польшчы, Расіі, Літвы і Малдовы, Латвіі і Балгарыі і інш.

“Нараджаецца” вытворчая тыражаваная кераміка. Створаны мастаком узор – эталон керамічнага вырабу – павінен адпавядаць тэхналагічнаму працэсу вытворчасці. У Беларусі аб`яднанне “Керамін” выпускае якаснае сантэхнічнае абсталяванне і будаўнічую плітку. Новыя ўзоры керамікі стварае на аб`яднанні знакамітая беларуская мастачка Т.Кіршына. Масавай фарфоравай прадукцыяй забяспечваюць жыхароў краіны фарфоравыя заводы ў Добрушы і Мінску.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ